# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ '91

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 18 КРАСАВІКА № 10 (1674)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.


## ЧЫРВОНЫ РАДОК

*У пакоі 214-м геаграфічнага корпуса арганізавана выстаўка-продаж жывапісных палотнаў не вельмі вядомага, але даволі таленавітага беларускага мастака Міколы Цудзіка. Зазірнуўшы сюды, некаторыя ўжо змаглі ацаніць дзесяткі пейзажаў, нацюрмортаў, эцюдаў... Праўда, што датычыць фінансавага боку, то аўтар сам ацаніў свае тварэнні — кошт некаторых карцін перавышае тысячу рублёў.*

*Як заўважылі на геафаку, усё лепшае ўжо знайшло свайго новага гаспадара. Тым не менш, усё гэта справа густу. Магчыма і ў тым, што ёсць у наяўнасці зараз, вы знойдзеце для сябе штосьці прывабнае, што ўпрыгожыць ваш рабочы кабінет ці ўласную кватэру.*

* * *

*Не зусім звычайная аб'ява сустракае кожнага наведвальніка чытальнай залы універсітэцкай бібліятэкі, перш чым той пераступіць яе парог. На дзвярах — выпіска з пратакола № 5 пасяджэння вучонага савета філасофска-эканамічнага факультэта. Згодна з ім студэнт 3 курса Г. Жданаў абавязаны кампенсаваць матэрыяльны ўрон, нанесены бібліятэцы. Лічба гэта дзесяцікратная ў параўнанні са шкодай. Але гэта, відаць, не самае непрыемнае для студэнта. Атрымаўшы вымову з занясеннем у асабістую картку і страціўшы права наведваць бібліятэку да ліпеня месяца, думаецца, студэнт навучыцца таму-сяму. Ды і іншым непанадна будзе.*

* * *

*Дорага нам абыходзіцца сёння здароўе — кошт санаторных пуцёвак значна падскочыў. А што, калі паспрабаваць «патрэсці кішэню» прафсаюзу? Студэнцкі прафком не супраць — ён сам прапануе сваім падапечным паправіць сваё здароўе, унёсшы 30 працэнтаў вартасці пуцёўкі, калі яна не перавышае 250 рублёў, і 15 працэнтаў — калі кошт пуцёўкі больш названай сумы.*

*Даведацца адрасы лячэння розных захворванняў нервовай сістэмы, органаў дыхання і стрававання, кровазвароту, нырак і іншых вы зможаце, патэлефанаваўшы на нумар 20-96-13, або непасрэдна ў прафкоме студэнтаў.*

## АГІТКА

# ТУЖЭЙ ЗАЦЯГНЕМ ПАЯСЫ!



*АДБЫЛОСЯ! Кухонныя баталіі і безадрасныя звароты ў чаргу перараслі ў стыхійны мітынг працоўных горада. Нават убаюканыя абяцанкамі аб кампенсацыях і датацыях зразумелі, што ў адзін дзень раптам збяднелі. А чаго было чакаць ад непадрыхтаванага псіхалагічна народа? Толькі непрадказальнасці.*

*3 красавіка паўстаў мінскі электрамеханічны завод імя В. І. Казлова. 4-га — на стыхійны мітынг на плошчы імя У. І. Леніна сабралася не 10 і не 50, а па дакладных даных 25 тысяч чалавек. Рабочыя МАЗа, МТЗ, завода медпрэпаратаў, студэнты педагагічнага, політэхнічнага, інстытута культуры, замежных моў і універсітэта патрабавалі павысіць зарплату прапарцыяльна росту цэн, адмяніць пяціпрацэнтны падатак ад продажу, скараціць упраўленчы апарат, паменшыць на 15 працэнтаў адлічэнні прыбытку прадпрыемстваў у дзяржбюджэт, накіраваўшы гэтыя грошы на аплату працоўным, нацыяналізаваць маёмасць КПБ, вывесці парткомы за межы прадпрыемстваў, аддаць міністэрскія лецішчы ў бязвыплатнае карыстанне чарнобыльцам, адстаўкі Прэзідэнта краіны, Кабінета міністраў, роспуск саюзнага і рэспубліканскага парламента і правядзення новых выбараў. Прыняты зварот да ўсіх працоўных рэспублікі, у якім змешчаны прызыў падтрымаць патрабаванні мінскага пралетарыята.*




*Забастоўка, зразумела, не палепшыць матэрыяльнае становішча працоўных, і ўсё ж спынена яна толькі на 10 дзён. Такі тэрмін прадастаўлены ўраду для вырашэння пастаўленых пытанняў.*

*А мы тым часам тужэй зацягнем паясы і выразім надзею, што нагадненне прыйдзе на змену канфрантацыі.*

*Фота С. ВАСІЛЬЕВА.*

## КАМЕНТАРЫІ

### ЗАЛІШНІЯ

# МАЎЧАЦЬ НЕЛЬГА

Людзі выйшлі на плошчу. Не ад добрага жыцця, вядома. Іх прывялі сюды не толькі пустыя паліцы крам і дарагія абеды ў сталовых. Самае страшнае тое, што страчана вера ў перамены да лепшага, не бачна ніякай перспектывы, а наперадзе — бездань. Зараз мы стаім на краі яе. Дык ці хопіць у нас розуму стрымаць сябе, не зрабіць апошні крок?

Што думаюць наконт гэтага студэнты і выкладчыкі універсітэта, у прыватнасці, геаграфічнага факультэта (мы знаро выбралі адзін, каб не «распыляцца») — тыя, хто не дыхае полымем лІцэйкі, але каго не ў меншай ступені закрануў «свежы вецер» перабудовы?

— Словы «мітынг», «забастоўка» сёння ці не самыя распаўсюджаныя. Людзі пакідаюць рабочыя месцы, спыняюць нават доменныя печы і ідуць на плошчу — апошнімі днямі яна стала для іх рабочым месцам. Ці адабраеце вы такое рашэнне?

Сяргей КАНАНОВІЧ, 2 курс:

— Адказаць катэгарычна «так» ці «не» нельга. Упэўнены толькі ў адным: лепш ад гэтага не стане. Такім вось «стыхійным бедствам» мы толькі паглыбім крызіс у эканоміцы і падштурхнём народ да галечы.

Але ж і маўчаць нельга. Магчыма рашучыя дзеянні прымусяць урад падумаць пра народ, зразумець яго боль і трывогу, дапамагчы перажыць такі цяжкі час. Людзі патрабуюць сацыяльнай абароненасці — і маюць рацыю. Скажыце, я, студэнт, змагу на сваю жабрацкую стыпендыю купіць кашулю за 75 рублёў? А астатняе?

— Вы спяшаецеся на мітынг?

Валерый РАДЗІВІЛКА, І курс:

— Так.

— Гэта проста жаданне быць там, дзе ўсе, ці ў вас ёсць нейкі свае мэты?

— Я лічу, што абавязак кожнага чалавека падтрымаць патрабаванні бастуючых. У нас, студэнтаў, свае рахункі да ўрада. Галоўны — дрэнная матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта: не хапае аўдыторый, інтэрнатаў, нізкая забяспечанасць тэхнічнымі сродкамі навучання... І гэта ў той час, калі партыйныя функцыянеры сядзяць у раскошных кабінетах.

(Заканчэнне на 2-ой стар.).

## ГАРАЧАЯ КРОПКА

# Сесці з шапкай у вугле?

Калі студэнцкія стыпендыі не будуць павялічаны да пражытачнага мінімуму, то менавіта так многім з іх і давядзецца зрабіць. На тыя грошы, якія маюць зараз студэнты, цяжка пражыць нават даволі сціпла. І таму калі работнікі прамысловых прадпрыемстваў выйшлі на плошчу і заявілі аб тым, што павышэнне цэн на харчовыя і прамысловыя тавары спіхне іх у бездну галечы, яны таксама вырашылі напомніць аб сабе і задаць кіраўніцтву рэспублікі пытанне: «Як выжыць студэнту?»

Яно на працягу ўсяго студэнцкага мітынгу, што адбыўся ў канцы мінулага тыдня на плошчы Якуба Коласа, лунала над шчыльным натоўпам. Сюды прыйшлі студэнт БДУ, БПІ, РТІ і іншых вышэйшых навучальных устаноў горада. Напэўна, падставай для гэтага ў нейкай ступені паслужыла і абляцеўшая некаторыя ВНУ чутка, быццам у гэтым месяцы стыпендыя студэнтам выдавацца не будзе — няма з чаго яе плаціць.

Але не толькі аб хлебе надзённым думаюць мітынгуючыя. Тут гучалі і іншыя патрабаванні. Напрыклад, адстаўкі Вярхоўнага Савета рэспублікі. Маладыя людзі выказалі таксама салідарнасць з забастоўкай рабочых.

Відаць, мітынг на плошчы Якуба Коласа з'явіўся штуршком для пачатку работы аргкамітэта па стварэнню гарадскога студэнцкага стачкома. Сярод дванаццаці прадстаўнікоў ВНУ горада — інстытутаў культуры, замежных моў, радыётэхнічнага і політэхнічнага — не было студэнтаў БДУ. Але навучэнцаў усіх ВНУ хвалююць адны і тыя ж клопаты — нізкая стыпендыя, дрэнная матэрыяльна-тэхнічная база. Усе яны, мяркуецца, будуць выкладзены ў звароце ў Вярхоўны Савет БССР, Савет Міністраў рэспублікі і Міністэрства народнай адукацыі.

## ДОШКА АБ'ЯЎ

**У вас няма грошай, але ёсць жаданне зарабіць іх, а таксама нядрэнна адпачыць у час летніх канікулаў? Завітайце на факультэт грамадскіх прафесій. Вам прапануюць такую магчымасць — папрацаваць важатымі ў піянерскіх лагерах. Сфарміраваныя педагагічныя атрады накіруюцца ў Мінскі раён і Феадосію.**

**ВАС ЧАКАЮЦЬ НА ФГП (ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, П. 61) ШТОДНЯ З 12 ДА 17 ГАДЗІН. ТЭЛЕФОН ДЛЯ ДАВЕДАК: 96-11-22.**

# ... Быць бы жыву

## АБАРАНІЦЕ!

**Калі адзенне прыйдзе ў непрыгоднасць, можна пакласці на яго латку. А вось калі «зносіцца» страўнік, «залатаць» яго не так проста, бо вярнуць страчанае здароўе немагчыма.**

**Павышаючы цэны на прадукты харчавання, безумоўна, нельга было не прадбачыць, што гэта адаб'ецца на здароўі людзей. Калі чалавек, які мае месячны аклад крыху большы, чым студэнцкая стыпендыя, яшчэ можа дазволіць сабе хаця б праз дзень паесці ў сталоўцы, то для студэнта гэта — самая сапраўдная раскоша. Каб падлічыць дэбіт і крэдыт будучых Мендзялеевых і Энштэйнаў, неабавязкова валодаць прыёмамі вышэйшай матэматыкі — вялікіх лічбаў складаць не давядзецца.**

**Са сваіх 120 рублёў студэнту кожны месяц пры самым сціплым харчаванні толькі на абеды патрэбна аддаць каля паловы грошай. З другой паловы выкраіць суму на сняданні і вячэры, часам булачку з кавай ці марожанае, яблыкі... Дарэчы, кажуць, што наш мозг не згодзен добра працаваць без «шакаладнай падкормкі». Напэўна, рухаць навуку наперад будуць не сённяшнія студэнты — мала хто з іх адважыцца выкінуць на яе дзесятую частку сваёй стыпендыі.**

**Карыстанне паслугамі службы быту, расходы на абутак, адзенне, кіно, тэатр, касметыку... — усе гэтыя выдаткі павінны ўкласціся ўсё ў тую ж шасцідзесяцірублёвую суму (не будзем браць у разлік бацькоўскі заробак). Вось зараз і давайце думаць, як выжыць?**

**Старшыня студэнцкага прафкома А. Д. КІШКЕВІЧ паведаміў нам, што прафсаюз не дасць сваім падапечным прапасці. На днях прынята рашэнне аб выплаце студэнтам кампенсацый на харчаванне. За красавік месяц кожны атрымае 25 рублёў. У цэлым па універсітэту гэта сума будзе даволі ўнушальнай — каля 250 тысяч рублёў. Толькі і гэта яшчэ адна падачка наўрад ці выратуе студэнта ад беднасці.**

**«Трэба прымаць нейкія рашучыя меры»,— аднагалосна выказалі сваё меркаванне старшыні студэнцкіх прафкомаў вышэйшых навучальных устаноў горада. Адна з іх, на іх думку, павышэнне памераў стыпендыі. Зараз цяжка прадбачыць, наколькі гэта рэальна, аднак тыя, каму, як кажуць, належыць па штату абараняць інтарэсы студэнтаў, намераны паводзіць сябе рашуча.**

## НЕ ПА ЧУТКАХ

# Палундра... адмяняецца

*«Палундра, грамадскія навукі «рэжуць». Навіна хутка разляталася па універсітэту. Што ж адбылося на самой справе? На гэта пытанне адказвае намеснік дэкана механіка-матэматычнага факультэта У. А. ГАБРЫНОВІЧ.*

— Ніхто нікога не рэжа. Проста з наступнага навучальнага года мы аддаём студэнту завяванае ім права выбару: па ўласнаму жаданню з прапанаваных грамадскіх дысцыплін выбраць тыя, якія, на яго думку, спатрэбяцца ў далейшай рабоце або проста будуць цікавымі.

Напрыклад, у першым і другім семестрах студэнтам прапануюць паралельныя курсы палітычнай гісторыі і гісторыі БССР. У канцы семестра — абавязковы экзамен.

— Прабачце, і як успрынялі гэту навіну грамадазнаўцы? А раптам на тых ці іншых лекцыях наведванне будзе нулявым?

— Яны не супраць такога падыходу. Гэта не нейкае наша дзівацтва. Ужо даўно ідзе размова аб тым, каб выкладанне тую ж гісторыю не ўхвалялі на ўсіх факультэтах без разбору поспехі калектывізацыі і індустрыялізацыі, а давалі матэрыял з улікам спецыфікі будучай работы. Дарэчы, што датычыць гісторыі, то ў нас будуць культывіравацца некалькі напрамкаў: гісторыя Айчыны (назва курса пакуль удакладняецца) і гісторыя сусветнай культуры.

Для выкладання новых (ці аднаўленых) курсаў мы не будзем абмяжоўвацца толькі універсітэцкімі выкладчыкамі і калі ўзнікне такая неабходнасць, запросім з іншых навучальных устаноў.

## КАМЕНТАРЫІ ЗАЛІШНІЯ

# МАЎЧАЦЬ НЕЛЬГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

**Алена ЗАНКОВІЧ, 4 курс:**

— Магчыма мы страцім штосьці. Толькі, мяркую, набудзем больш. Падзеі апошніх дзён падштурхнуць наш парламент да прыняцця рэальных праграм і правядзення эканамічных рэформ.

Калі б я атрымала магчымасць выступіць на трыбуне, то абавязкова выказалася б супраць: пяціпрацэнтнага падатку (дарэчы, калі верыць «Аргументам и фактам», наша рэспубліка па гэтаму паказчыку ў перадавіках), павышэння цэн на тавары дзіцячага асартыменту (як звесці канцы з канцамі студэнцкай сям'і з дзіцем, якая жыве на прыватнай кватэры?), не па студэнцкай кішэні абедаў у сталовай (чаго варты той рубель у дзень, які нам ахвяруе прафсаюз, калі на яго хіба толькі стакан соку можна купіць).

**— Як вы лічыце, ці не лепш было б на час адмовіцца ад палітычных лозунгаў? Мажліва ёсць сэнс спачатку разабрацца з эканомікай?**

**Эдуард МАРЧУК, 2 курс:**

— Я перакананы: эканоміка і палітыка непадзельныя. Цяперашні ўрад зрабіў сваю справу — на большае ён не здатны. Хаця тое, што мы маем магчымасць мітынгаваць і баставаць, я не стаўлю ў заслугу Прэзідэнту. Гэта ўсё роўна здарылася б не сёння — заўтра. Усё ішло да гэтага. А тэрміны на эксперымент ужо хопіць адпускаць.

— Расціслаў Афанасьевіч, прабачце за парушэнне субардынацыі, але пакуль падымалася да вас, паспела пагутарыць са студэнтамі з нагоды галоўнай падзеі сённяшняга дня — мітынгу. Многія з іх сказалі, што паставілі б свае подпісы пад патрабаваннямі бастуючых і паступілі б іменна так. Між іншым, у вашым кабінеце вісіць партрэт Гарбачова, а на плошчы людзі крычаць: «Далоў!» Вы б далучыліся да іх?

**Расціслаў Афанасьевіч ЖМОЙДЗЯК, дэкан:**

— Партрэт не перашкаджае мне працаваць. Не спрачаюся: у складаны час мы жывём, але не трэба забываць і пра тое станоўчае, чым мы абавязаны ўраду.

Наўрад ці можна ў мітынговым хаосе вырашаць важнейшыя пытанні. У нас ёсць Канстытуцыя, і мы павінны прытрымлівацца яе, інакш заўсёды будзе панаваць анархія.

Упэўнены, калі б урад своечасова правёў адпаведныя рэарганізацыі (напрыклад, па скарачэнню адміністрацыйнага апарату, зменах у арміі і інш.), то людзі не так агрэсіўна паводзілі сябе сёння. А зараз нас могуць выратаваць толькі радыкальныя меры.

Запісала З. АЛЯШКЕВІЧ.

## КАМПЕТЭНТНЫ СУБЯСЕДНІК

# Час дае шанц

**Сённяшнія буры і ўзрушэнні здольны змяніць многае ў жыцці. Але нават самыя моцныя з іх не пазбавяць нас неабходнасці прыняць новую Канстытуцыю нашай рэспублікі.**

**Існуе пакуль два праекты новага Асноўнага закону Беларусі, падрыхтаваны абодвума рабочымі групамі Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета БССР. Грунтоўнае іх абмеркаванне адбылося на Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Канцэпцыя Канстытуцыі БССР і фарміраванне прававых асноў грамадзянскага грамадства і дзяржавы», што праходзіла ў канцы лютага і была арганізавана Канстытуцыйнай камісіяй Вярхоўнага Савета БССР і юрыдычным факультэтам БДУ імя У. І. Леніна.**

**Работу адной з секцый на канферэнцыі ўзначальваў доктар юрыдычных навук, прафесар БДУ Анатоль Іванавіч БОБЫЛЕЎ.**

**— Анатоль Іванавіч, да якіх вывадаў па праектах Канстытуцыі прыйшлі юрысты на канферэнцыі?**

— Я магу з упэўненасцю гаварыць аб меркаваннях тых, каго аб'яднала наша чацвёртая секцыя «Новая Канстытуцыя рэспублікі і развіццё Савецкага права». З дапамогай параўнальнага метаду, які выкарыстоўваўся большасцю выступаючых на секцыі, перавага часцей за ўсё аддавалася другому праекту, хоць у ім таксама адзначаны шэраг сур'ёзных недахопаў.

Прыйшлі мы таксама да аднадушнага вываду, што ёсць неабходнасць стварэння з двух існуючых праектаў аднаго, канчатковага, які будзе вынесены на ўсенароднае абмеркаванне. У ходзе работы над гэтым праектам абавязкова трэба ўлічыць вопыт распрацоўкі Асноўнага закону ў іншых рэспубліках Савецкага Саюза і ў развітых еўрапейскіх краінах. Удзельнікі нашай секцыі найбольш часта звярталіся да вопыта заканадаўцаў Расіі.

**— Ці будуць пачуты ў Беларускім парламенце прапановы вучоных, якія выказаны на канферэнцыі?**

— Гарантыяй гэтага павінна быць ужо тое, што Вярхоўны Савет — адзін з арганізатараў канферэнцыі. Яе тэзісы былі распаўсюджаны сярод дэпутатаў, значыць, і прачытаны хаця б часткай з іх. А на самой канферэнцыі ніводнага народнага дэпутата Беларусі мы не ўбачылі. Дзіўна.

**— Якія змены і дапаўненні здаюцца Вам найбольш патрэбнымі для новай Канстытуцыі?**

— Пачаць хачу з таго, што ў абедзвюх рабочых групах па падрыхтоўцы праектаў працавалі ў асноўным юрысты-дзяржавазнаўцы. Натуральна, што яны надавалі ўвагу перш за ўсё пытанням, якімі займаюцца ў сваёй навуковай дзейнасці. Таму многія істотныя моманты былі ўпушчаны.

Я не вазьмуся зараз разгледзець кожны праект падрабязна, скажу толькі пра папраўкі, якія здаюцца мне жыццёва важнымі.

Больш за ўсё мяне хвалюе лёс той часткі Канстытуцыі, якая павінна быць прысвечана экалогіі. І не толькі таму, што я непасрэдна займаюся гэтай сферай як юрыст. Неабходнасць карэнных змяненняў у рэгуляванні пытанняў экалогіі ў Канстытуцыі БССР сапраўды наспела. І дзіўна, што гэта не ўлічана ў абодвух праектах: у другім экалагічныя праблемы не найшлі адлюстравання наогул, а ў першым асветлены недастаткова.

Нават у папярэдняй Канстытуцыі Беларускай ССР (1978 г.) пытанні рацыянальнага выкарыстання і аховы навакольнага асяроддзя былі прадстаўлены шырэй. З таго часу экалагічнае становішча ў рэспубліцы істотна змянілася, перш за ўсё пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. 60 працэнтаў забруджанай яе выкідамі плошчы нашай краіны прыйшлося на тэрыторыю Беларусі, а гэта больш чым два з паловай мільёны людзей у 27 гарадах і 3 тысячах іншых населеных пунктаў. Пэўна, нам не хапіла пяці гадоў пасля Чарнобыля, каб па-сапраўднаму ўсвядоміць маштаб і магчымыя вынікі гэтай катастрофы. Размова сапраўды ідзе пра выжыванне беларускай нацыі. Таму будучая Канстытуцыя па эканамічных, экалагічных, дэмаграфічных і іншых аб'ектыўных прычынах, бясспрэчна, павінна замацаваць прававыя нормы, якія давалі б права ўсім людзям на валоданне прыроднымі рэсурсамі, вызначалі прынцыпы іх разумнага выкарыстання і аховы навакольнага асяроддзя ў цэлым ад поўнай дэградацыі.

На жаль, нават без чорнага ўкладу чарнобыльскай бяды ў экалогію Беларусі наша рэспубліка не вельмі багатая прыроднымі рэсурсамі, і зараз назіраецца іх моцнае спустошэнне. У той жа час адбываецца назапашванне іншых «багаццяў» — магутных прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія эксплуатуюць прыродныя запасы і забруджваюць асяроддзе.

Акрамя таго, за апошні час Вярхоўныя Саветы СССР і БССР прынялі шэраг заканадаўчых актаў, якія ўнеслі істотныя змяненні ў парадак прававога рэгулявання экалагічных адносін у рэспубліцы, што не можа быць не адлюстравана ў Канстытуцыі.

Я лічу, што ў ёй абавязкова павінна быць асобная глава ці артыкул, прысвечаны экалагічнаму развіццю і экалагічнай бяспецы. Гэта неабходна ўжо хаця б таму, што такі артыкул ёсць у Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце, а такія істотныя разыходжанні паміж Дэкларацыяй і Канстытуцыяй недапушчальныя.

Калі звяртацца да лепшага вопыту іншых краін, дык там канстытуцыйнае рэгуляванне экалагічных пытанняў наладжана яшчэ ў 70-я гады.

Акцэнт рабіўся і робіцца перш за ўсё на праве грамадзян жыць у спрыяльным навакольным асяроддзі. Асабліва яскрава гэта выражана ў Канстытуцыі Партугаліі. У яе 66-м артыкуле зацверджана права кожнага на здаровае і экалагічна збалансаванае асяроддзе. Там жа ставіцца ў абавязак дзяржаве ўзмоцненае і хуткае паляпшэнне жыцця ўсіх партугальцаў. Менавіта такое дзяржава павінна адказваць за гэта. Больш таго, яе абавязкі канкрэтна пералічаны.

Было б недапушчальна для нас не ўлічыць такі карысны вопыт. Калі ў Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце рэспубліка ўстанаўлівае свае правы ў забеспячэнні экалагічнай бяспекі, то ў Канстытуцыі павінен змяшчацца пералік абавязацельстваў беларускай дзяржавы па экалагічнаму развіццю рэспублікі і экалагічнай бяспецы насельніцтва. Яны могуць быць сфармуляваны, як мне здаецца, прыкладна так: 1) ажыццявіць меры па паступоваму скарачэнню і наступнай поўнай ліквідацыі паступлення ў прыроднае асяроддзе небяспечных для здароўя чалавека рэчываў; 2) забяспечыць экалагічна абгрунтаванае размяшчэнне і далейшае развіццё вытворчых сіл рэспублікі; 3) ажыццявіць сістэму кантроля за паказчыкамі здароўя насельніцтва з выяўленнем фактараў навакольнага асяроддзя, якія аказваюць негатыўны ўплыў; 4) ствараць і развіваць на тэрыторыі рэспублікі запаведнікі, заказнікі, помнікі прыроды, нацыянальныя паркі з мэтай забеспячэння аховы прыроднага асяроддзя і абароны гістарычных і культурных каштоўнасцей; 5) дабіцца ў рэспубліцы рацыянальнага прыродавыкарыстання, здольнага забяспечыць экалагічную стабільнасць.

Зразумела, што абавязкі па ахове навакольнага асяроддзя павінны ўскладацца не толькі на дзяржаву, але і на грамадзян, а асабліва на прыродакарыстальнікаў — тых, хто не абыходзіцца ў сваёй дзейнасці без прыродных рэсурсаў (маюцца на ўвазе не толькі асобныя людзі, але і прадпрыемствы).

Я лічу, што было б мэтазгодна з нашага боку ўлічыць яшчэ адзін прыклад з вопыту партугальскай Канстытуцыі. У ёй замацавана патрабаванне аб прад'яўленні іску ўсім, хто пагражае прыродзе, наносіць ёй урон. Іск гэты павінен пакрываць усе нанесеныя выдаткі і ліквідаваць прычыны парушэнняў. Таксама і кожны чалавек мае права судовым парадкам прад'явіць дзяржаве іск аб пакрыцці шкоды, што нанесена яго здароўю ці маёмасці.

**— Пералічаныя аспекты сапраўды выглядаюць як вельмі патрэбныя нашай Канстытуцыі. Калі дапусціць, што ўсім ім знойдзецца ў ёй месца, ці будзе ў такім разе тэкст Асноўнага закона адпавядаць Вашым уяўленням аб ім?**

— Нават у такім выпадку ёсць яшчэ некалькі важнейшых праблем, без разгледжання якіх новая Канстытуцыя застанецца далёкай ад дасканаласці. Я маю на ўвазе некаторыя сацыяльныя і эканамічныя аспекты развіцця нашай рэспублікі.

Прычына майго неспакою з гэтай нагоды тая ж самая: сацыяльнаму развіццю ў абодвух праектах рабочых груп Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета надаецца невялікая ўвага. На мой погляд, Канстытуцыя перш за ўсё павінна вызначыць сённяшні ўзровень нашага сацыяльнага развіцця. У часткі людзей і зараз яшчэ ранейшае ўяўленне аб ім як аб лепшым у свеце. Магчыма, з-за скажонага разумення таго, што такое сацыяльнае развіццё. А менавіта яно вызначае ўзровень умоў жыцця і працы — таго, чым мы не можам пакуль пахваліцца.

Я думаю, у нашай Канстытуцыі можна ўзяць за ўзор фармулёўку з Асноўнага закону РСФСР: «дасягнуць вартага чалавека ўзроўню жыцця». З яе вынікаюць абавязкі дзяржавы па забеспячэнню сацыяльнага развіцця такога ўзроўню. І, зноў жа, ніхто іншы як сама дзяржава павінна забяспечыць сацыяльную абарону людзей. Але пры гэтым выглядае, як мне здаецца, неабгрунтаваным уключэнне ў Канстытуцыю пытання пра льготы і прывілеі, як зрабілі аўтары першага праекта. Вырашэнне гэтай праблемы, падкрэсліваю, зусім не канстытуцыйнай, павінна ўтрымлівацца ў канкрэтным заканадаўстве па эканамічнай рэформе. А на практыцы адказ на гэта пытанне трэба шукаць з дапамогай той жа рэальна існуючай сацыяльнай абароненасці.

**— Якая група нашага насельніцтва, на Ваш погляд, мае патрэбу ў ёй найбольш востра?**

— Я б сказаў, што сяляне. На жаль, нам пакуль далёка да такога цывілізаванага грамадства, дзе сялянства займае ганаровае становішча, дзе ў яго ёсць рэальнае права мець зямлю ва ўласнасці. Знішчэнне памешчыцкай (прыватнай) уласнасці на зямлю адразу пасля рэвалюцыі, зробленае пад маркай «ліквідацыі мацнейшай апоры контррэвалюцыі», цалкам пазбавіла селяніна эканамічнай свабоды, права быць уласнікам і вытворцам адначасова. Вяртанне сялянам прыватнай уласнасці на зямлю стала б і той гарантыяй іх правоў, якой яны былі пазбаўлены ўсе гады Савецкай улады.

**— Ці ёсць патрэба вырашаць гэту праблему ў Канстытуцыі, калі можна прыняць канкрэтнае заканадаўства?**

— У даным выпадку патрабуецца вырашэнне на самым высокім заканадаўчым узроўні. У нас ёсць ужо Закон БССР «Аб уласнасці ў Беларускай ССР» і Кодэкс Беларускай ССР аб зямлі, але не адзін з гэтых актаў пытанне аб прыватнай уласнасці не вырашыў. Закон устанавіў, што прадастаўленне зямлі грамадзянам рэспублікі павінен вызначаць Кодэкс, а той дапускае толькі раней прынятыя формы прадастаўлення зямлі — ва ўладанне, карыстанне і на ўмовах арэнды.

Праект Кодэкса аб зямлі абмяркоўваўся народнымі дэпутатамі Беларусі, 84 з іх выказаліся за ўстанаўленне акрамя ранейшых форм і прыватнай уласнасці на зямлю. Яны былі ў меншасці, але іх пункт гледжання павінен знайсці прававое замацаванне, бо гэтыя дэпутаты выступілі ад імя многіх выбаршчыкаў.

**— Ці ёсць у Вас упэўненасць, што ў будучай Канстытуцыі будуць адлюстраваны Вашы пажаданні і прапановы?**

— Вельмі хочацца, каб здарылася так.

Пытанні задавала Вераніка БЯГУН.

## АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

# Абмен працягваецца

У мінулым годзе, як сцвярджае прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа, універсітэт прыняў 175 замежных спецыялістаў, дэлегацый і студэнтаў. 87 навучэнцаў прайшлі ў нас вытворча-азнаямленчую практыку. Значыць, і мы не лыкам шытыя — таксама ўяўляем для іх нейкую цікавасць.

Што датычыць нашых візітаў за мяжу, то іх у 1990 годзе было ў два разы (і нават з гакам) больш.

На пасяджэнні вучонага савета, на парадку дня якога стаяла пытанне аб стане і мерах па павышэнню эфектыўнасці вучэбнага, навуковага і культурнага супрацоўніцтва універсітэта з ВНУ і навуковымі ўстановамі замежных краін, прыведзена такая статыстыка: сумесныя даследаванні паміж універсітэтамі-партнёрамі праводзяцца па 36 тэмах. Навуковыя рэзультаты іх выкарыстаны пры напісанні 20 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, выданні 18 манаграфій, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, падрыхтоўцы 135 дакладаў на навуковых сімпозіумах, канферэнцыях, семінарах, 310 навуковых артыкулаў, апублікаваных у СССР і за мяжой, і г. д. Чым далей, тым больш скрупулёзна ўсё падлічана.

Але, аказваецца, усяго гэтага недастаткова — «у міжнародным супрацоўніцтве універсітэта маюцца недахопы і ўпушчэнні». Магчыма, неістотныя? Падлічыўшы ў рашэнні вучонага савета ўсе «недастаткова» і «маюць месца», гэтага не скажаш. Сапраўды, даволі сур'ёзна гучаць заўвагі аб тым, што выкарыстанне вынікаў сумесных пошукаў для ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу і навуковых даследаванняў пакідае жадаць лепшага. Не на ўзроўні і сувязі БДУ з іншымі навуковымі ўстановамі за мяжой на кантрактнай, патэнтна-ліцэнзійнай і кааператыўнай аснове...

Вучоны савет прааналізаваў сітуацыю і даў «выпраўленчы тэрмін», каб «прыняць неабходныя меры па ліквідацыі недахопаў у арганізацыі сувязяў з ВНУ — партнёрамі і навуковымі ўстановамі сацыялістычных і капіталістычных краін, а таксама краін, якія развіваюцца». Мяркуюць, што дапаможа гэтаму савет па міжнароднаму супрацоўніцтву, які і вырашана стварыць аднадушным «за» прысутных. Ён зоймецца распрацоўкай рэкамендацый па супрацоўніцтву, «абменных» праграм, адборам кандыдатаў для паездкі за мяжу.

## НЯМА ПРАБЛЕМ?

# Пасля дожджыку ў чацвер?

Валакіты і бюракратызму ў нас дастаткова. А тут з'явілася яшчэ адна магчымасць выпрабаваць наша цярпенне.

І хто толькі прыдумаў гэтыя кампенсацыі і датацыі? Колькі з-за іх усялякіх непрыемнасцей і нязручнасцей. Словам, працаваць няма калі, толькі і бегай за даведкамі ды стой у чарзе, каб здаць іх каму-небудзь.

Добра, калі ў цябе дзеці-блізняты, а калі розніца ва ўзросце 2—3 гады?

...Да пакою № 28 бухгалтэрыі кожны чацвер а другой гадзіне выстройваецца доўгая і даволі шчыльная чарга. Гэта тыя, хто мае дзяцей ва ўзросце да 6 гадоў. Тут яны абавязаны пакінуць заяву з просьбай назначыць дапамогу на дзяцей (безумоўна, якія адпавядаюць названаму ўзросту), прыкласці да яе даведку з ЖЭСа аб саставе сям'і, копію пасведчання аб нараджэнні і дзве даведкі аб сярэднім заробку — бацькі і маці.

Даходы мужа, безумоўна, ведаць трэба, хоць я і не згодна з «выбарчым» прынцыпам размеркавання дапамогі. А вось з паперай на імя маці крыху несур'ёзна атрымліваецца: бухгалтэрыя выпісвае і выдае штодня горы даведак, каб прадаставіць іх... самім сабе.

Калі дзеці ў вас не аднаго ўзросту, то спяшайцеся заняць яшчэ адну чаргу — у аддзел кадраў. Тут аформіце кампенсацыю на старэйшых. Дарэчы, не забудзьцеся адразу, як толькі ў вас будуць на руках усе пералічаныя даведкі, зняць з іх копіі — тут яны як раз і спатрэбяцца.

— Я наогул пераконваў усё гэта спрасціць,— заўважае начальнік аддзела кадраў А. М. Чэкан.— Але маю прапанову выдаваць кампенсацыі па заявах, не падтрымалі. Знайшліся такія, хто перастрахаваўся: маўляў, а раптам хто-небудзь замест дваіх дзяцей запіша траіх?

Але ж мы можам пазбегнуць гэтага. Прымаючы заяву, няцяжка зазірнуць у пашпарт і праверыць пасведчанні аб нараджэнні. І справа вырашана. Толькі не прывыклі мы жыць без цяжкасцей.

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ПАДАЛІСЯ Ў ПРАФЕСІЯНАЛЫ

**Калі вы прывыклі бачыць іх штодня на кафедры фізвыхавання і спорту, не засмучайцеся: так будзе і надалей. Проста Васіль Мялюсік, які працуе тут выкладчыкам, і яго калега старшы лабарант Анатоль Кудрын вырашылі праверыць свае магчымасці ў вялікім спорце.**

**На чэмпіянаце рэспублікі па бегу Васіль адважыўся выйсці на дыстанцыю 3000 і быў першым. Зараз, называючы яго прозвішча, можна гаварыць: чэмпіён Беларусі па бегу на 3000 метраў.**

**На жаль, да яго сябра фартуна не была так прыхільна — забег на 1500 метраў А. Курын адолеў толькі трэцім. Але ў яго ёсць «змякчаючыя акалічнасці» — надта маладыя са試пернікі.**

ВЫ ЧУЛІ?

## Дазволена стаць магістрам

Універсітэт Дружбы народаў імя П. Лумумбы першым з вышэйшых навучальных устаноў перайшоў на прынятую ў большасці еўрапейскіх краін двухступенчатую сістэму падрыхтоўкі кадраў.

Цяпер усе выпускнікі універсітэта атрымаюць дыпломы бакалаўраў, што адпавядае чатырохгадовай базавай падрыхтоўцы па той ці іншай спецыяльнасці. Лепшыя студэнты працягнуць навучанне ў магістратуры, дакумент пасля заканчэння якой дасць ім права займацца навукова-даследчай і выкладчыцкай дзейнасцю.

Доўга працягвалася барацьба ведамага ў краіне і за яе межамі універсітэта за новую мадэль арганізацыі навучальнага працэсу, якая выгадна і для дзяржавы, і для ВНУ, і для студэнтаў, бо найбольш адпавядае іх інтарэсам. І вось, нарэшце, Г. Ягадзін дазволіў (праўда, у парадку эксперыменту) і савецкім студэнтам вучыцца па новай сістэме.

Зараз ва універсітэце поўным ходам ідзе перагляд праграм і планаў, які базіруецца на сувязі іх з навучальнымі курсамі лепшых універсітэтаў ЗША, Вялікабрытаніі, Японіі. Сацыяльныя раздзелы многіх прадметаў пераносяцца за межы бакалаўраў — іх будуць вывучаць толькі прэтэндэнты на магістарскую ступень...

ДУ Ю СПІК ІНГЛІШ?

## БАРОМЕТР ПАКАЖА «ЯСНА»

**Зараз амаль кожны інтэлігентны чалавек хоча свабодна размаўляць па-англійску (іншыя мовы — нямецкая, французская, іспанская — такой папулярнасцю не карыстаюцца). Наколькі ажыццявімы такі намер у сценах універсітэта? Аб гэтым гутарка з загадчыцай кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў Святланай Васільеўнай ЛУЗГІНОЙ.**

**— Святлана Васільеўна, скажыце, чаму мы менавіта зараз загаварылі аб недастаткова высокім узроўні выкладання замежных моў?**

— Гадоў дзесяць назад выкладчыку дастаткова было навучыць студэнта чытаць спецыяльную літаратуру. Тады апошні і марыць не мог аб паездцы за мяжу для стажыроўкі ці ўдзелу ў міжнародных семінарах і канферэнцыях. Зараз гэта — рэальнасць. Таму з'явілася неабходнасць у веданні замежнай мовы.

**— Прабачце, але ж навучыцца ёй можна толькі размаўляючы...**

— І не за дзве гадзіны — на некаторых факультэтах, на жаль, яшчэ можна знайсці гэты прадмет у раскладзе заняткаў толькі раз у тыдзень.

Выкладанне замежнай мовы можа быць паспяховым толькі тады, калі хапае добрых падручнікаў, кабінеты аснаяшчаны магнітафонамі, відэатэхнікай, а ў нас відэакласс і да гэтага часу не абсталяваны. Студэнт не павінен чуць толькі голас выкладчыка — патрэбны розныя палітры галасоў. Важна ўспрымаць замежную мову на слых. З дапамогай тэхнікі мы можам дасягнуць гэтага. На жаль, пакуль ажыццявіць намер не так проста, бо набываць касеты, каб «нагаварыць» на іх тэксты, відэастужкі нашым выкладчыкам даводзіцца на ўласныя грошы. Добра, што на кафедры склаўся нядрэнны калектыў, які гатовы дзеля справы на ахвяраванні.

**— Напэўна, крыўдна, калі студэнты не цэняць гэтага і прытрымліваюцца прыкладна такога меркавання: навошта лішнім галаву тлуміць?**

— І яны памыляюцца. Маё глыбокае перакананне: сучасны малады чалавек, калі ён хоць крыху прэтэндуе на добры прафесійны ўзровень і на інтэлігентнасць, абавязкова павінен нядрэнна валодаць хаця б адной замежнай мовай. Без яе немагчыма веданне культуры, знаёмства з літаратурай у арыгінале.

**— Святлана Васільеўна, не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што якасць ведаў нашых выпускнікоў па замежнай мове залежыць не толькі ад выкладчыка, але і, у першую чаргу, ад багажа, набытага ў школе.**

— А ён, прама скажам, не надта вялікі. Нас вельмі непакоіць сёння тое, што школьныя падручнікі і праграмы не адпавядаюць сучасным патрабаванням, а настаўнікі-замежнікі не рыхтуюць вучняў да моўнай дзейнасці і зносін. Пераклад дзесяцікласнік сяк-так невялічкі тэкст з падручніка — і добра. Да таго ж, у сельскай мясцовасці каля 30 працэнтаў настаўнікаў наогул не спецыялісты і ўсяго каля 40 працэнтаў школ маюць уласнае лінгафоннае абсталяванне, астатнія — як бог дасць. Недастатковая колькасць гадзін, што адведзены на вывучэнне замежнай мовы, таксама не дазваляе эфектыўна арганізаваць вучэбны працэс.

**Магчыма, таму вы і вашы калегі з іншых ВНУ горада распрацавалі і прадставілі на разгляд канцэпцыю выкладання замежных моў у сярэдніх навучальных установах?**

— Гэта так. Мы дасканала праналізавалі стан і патрэбы грамадства ў вывучэнні замежных моў у сярэдніх навучальных установах і прапануем узяць на ўзбраенне так званы камунікатыўны сістэмна-дзейсны падыход. Што гэта такое? Мы павінны заахвоціць школьніка ў сістэматычным авалоданні замежнай мовай як сродкам зносін і інструментам моўнай дзейнасці ва ўсіх яе відах. Гэта значыць у гаворцы, пісьме, чытанні. Дарэчы, вучэбны працэс будзе строга дыферэнцыраваны. Мы прапануем, так бы мовіць, пяць мадэлей арганізацыі навучання.

Першая мадэль разлічана на дзяцей І—ІІ класаў агульна-адукацыйнай школы (даказана, што ўспрымальнасць дзяцей чатырохадзінаццаці гадоў да авалодання мовамі надзвычай высокая).

Другой мадэллю ў большасці карыстаемся зараз, выкладаючы замежную мову, пачынаючы з пятага класа да адзінаццатага. А вось трэцяя ўжо скіравана на вышэйшую школу і авалоданне прафесіямі, у якіх выкарыстанне замежнай мовы абавязкова. Гэта перакладчыкі, настаўнікі замежнай мовы, машыністкі, праграмісты і інш.

Апошнія дзве мадэлі (чацвёртая і пятая) абумоўлены неабходнасцю падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці з выкладаннем замежнай мовы.

Калі тое, што прапануем, стане рэальнасцю, мы не будзем больш мець падстаў для нараканняў. І ў ВНУ, бясспрэчна, справы пойдуць лепш. Галоўнае, чаго трэба тут прытрымлівацца, ажыццяўляць выкладанне замежнай мовы з улікам і выкарыстаннем дасягнутага ў школе ўзроўню. Пры гэтым навучанне трэба дыферэнцыраваць у адпаведнасці з мадэллю, па якой выкладалася замежная мова ў школе, будучай спецыяльнасцю і ў той жа час не скідваць з рахунку рэальнае валоданне студэнтам мовай. З улікам гэтых фактараў і неабходна фарміраваць вучэбныя групы.

**— Непасрэдна на вашай кафедры так і дзейнічаюць?**

— Узровень выкладання ў нас нядрэнны. Большасць выкладчыкаў прайшлі стажыроўку за мяжой, дзе, дарэчы, набылі шмат падручнікаў і дапаможнікаў. Дрэнна толькі тое, што пакуль даводзіцца таксама працаваць і за сярэднюю школу. Вось калі там зменяцца справы з замежнай мовай, упэўнена, і ў нас барометр пакажа «ясна».

Інтэрв'ю правяла
З. АЛЯШКЕВІЧ.

САКРЭТ ФІРМЫ

## Падатак з вучобы

Праект Асноў заканадаўства СССР па народнай адукацыі разглядаецца Прэзідэнтам СССР.

Прадугледжваецца, што строга бясплатнай будзе дашкольная, сярэдняя і прафесійная адукацыя, атрыманая ў дзяржаўных вучэбных установах. Пытанне аб платнасці вышэйшай адукацыі застаецца адкрытым. Па словах старшыні Камітэта Вярхоўнага Савета СССР па народнай адукацыі і выхаванню Уладзіміра Бяляева, можна разлічваць на бюджэтныя «ўліванні» ў асноўную адукацыю, а ВНУ заахвочваюцца да самастойных заробкаў. Праўда, так і не зразумела, ці з'яўляюцца імі штрафы за пераздачы экзаменаў, прагулы і іншыя паборы.

## Школа вусатых няняў

Магчыма, у выпускніка гістарычнага факультэта Ленінградскага універсітэта Алега Кільчычакава было нудотнае дзяцінства з недахопам сапраўдных выхавацеляў. Не пашчасціла на «ружовы ранак» пэўна, і многім вопытным педагогам, а таксама кіраўнікам прадпрыемстваў-спонсараў.

Таму агульнымі намаганнямі яны адкрылі ў Ленінградзе школу гувернёраў, дзе пачалі заняткі больш за сто чалавек. Асаблівым попытам карыстаюцца педагогі-мужчыны. На іх паступіла столькі заказаў, што не задаволіць і цэлы выпуск. Хоць першыя гувернёры будуць няньчыць толькі дзяцей ва ўзросце ад двух да сямі гадоў, пры ўласным узросце ад 16... да 55. Стаць гувернёрам няпроста: трэба ўкласці спачатку 540 рублёў, а потым дасканавала вывучыць дзіцячую псіхіку, рэжым для дашкалят. У вучэбнай праграме — музыка, спорт, літаратура, фальклор, асновы інфарматыкі, матэматыкі, добрыя манеры.

## SOS з інстытута

Камітэт сацыяльнай абароны выкладчыкаў і студэнтаў «SOS» створаны не так даўно пры прафкоме Новасібірскага педагагічнага інстытута.

З наступнага вучэбнага года ў НДПІ ад 25 да 50 працэнтаў першакурснікаў будуць «камерцыйнымі». «SOS» паклапоціцца, каб частка атрыманых за іх навучанне грошай ішла на патрэбы выкладчыкаў і студэнтаў. Для «самастойных» заробкаў пры камітэце плануецца арганізаваць цэнтр прадпрымальніцкай дзейнасці.

Камітэт не мае дакладнай структуры. Здаецца, гэта не проста грамадская арганізацыя, але і спосаб існавання.

## І мы вясну гукалі

Гуканне вясны, старажытны язычніцкі абрад, першае па часе веснавое свята. У асобных месцах пачыналася 1 сакавіка с. ст., усюды — з 25 сакавіка на благавешчанне... Паступова абрад гукання вясны ператварыўся ў прыгожае свята, забаву моладзі і ў такім выглядзе дайшоў да нашых дзён.

(Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя).

**Студэнты геаграфічнага факультэта БДУ імя Леніна — актывісты універсітэцкай суполкі ТБМ імя Ф. Скарыны Г. Вінярскі, Т. Ількевіч, Ю. Кундрад, А. Галіч, В. Емяльянчык — вырашылі правесці абрад гукання вясны на радзіме народнага песняра ў Вязыцы. Іх шчыра падтрымаў старшыня універсітэцкай Рады У. А. Навумовіч, згадзіліся падзяліцца сваім багатым вопытам і нават прыняць удзел «талакоўцы».**



Гэта не першае гуканне вясны — у «Вячэрнім Мінску», «ЛіМе» ўжо было паведамленні аб святкаваннях старажытнага абраду ў Мінску, але хацелася быць бліжэй да зямлі, хацелася прынесці вясну, цяпло, усмешку, сонца на гэту святую для кожнага свядомага беларуса зямлю.

Далёка ад горада? Не будзе масавасці? Але ці так ужо яна патрэбна ў правядзенні абраду? Гэта ж не канцэрт, а свята, забава моладзі, па сутнасці, для сябе — паедуць аднадумцы, паедуць сябры.

Сапраўды, гулянне ў Вязынцы не было мнагалюдным (хаця аб'ява вісела ў галоўным корпусе універсітэта ўжо за тыдзень), а як зацягнуўся пачатак, то і рэдкія гледачы пачалі разыходзіцца. Але вось пабраліся за рукі дзяўчаты, хлопцы, няроўным шнурам пацягнулася з гары стракатая чародка, і зазвінела песня...

Яшчэ адчувалася некатарая скаванасць: ці так робім, ці свята гэта, калі няма натоўпу, гледачоў, калі робіш для сябе і сваіх сяброў? Але ўсё ішло сваім парадкам. Былі карагоды, гульні, гарэла на вошнішчы «зіма», паднеслі ахвяру зямлі-карміцельцы. Пасля абраду загучала гітара, сучасная песня. Сам ход падзей перамагаў няўпэўненасць.

Абуджэнне свядомасці нашага грамадства ў кожным асобным выпадку выяўляецца па-рознаму: для каго гэта магчымасць адысці ад усялякіх спраў у поўную меру сталоць даўнюю смагу па бестурботнаму існаванню, для каго адкрыліся магчымасці заняцца бізнесам, хто звярнуўся да рэлігіі, хто праявіў сябе як заўзяты меламан, каму даспадобы палітыка, а нейкая частка шчыра захапілася ідэяй нацыянальнага адраджэння. Няхай апошніх не так многа, як тою хацелася б, але энергічнасць моладзі, адданасць справе, напорыстасць надаюць веры, што выпакутаваная мара пра росквіт беларускай нацыі як роўнай сярод роўных, яе мовы, культуры не загіне, а знойдзе паўнакроўнае ўвасабленне ў самыя блізкія часы.

На жаль, сёння зноў не чуваць ад партыйных дзеячаў, выкладчыкаў, адміністрацыі просьбаў аб дапамозе ў авалоданні роднай мовай. Прайшла леташняя разгубленасць ад прыняцця закона, многіх супакоіла праграма (5—10 гадоў, калі тое будзе!), узмацнілася спадзяванне, што чарговая (пасля барацьбы з п'янствам) кампанія выдыхлася. Няўжо так?..

Але глядзіш на натхнёныя твары будучых географаў, гісторыкаў, філолагаў, юрыстаў, на «талакоўцаў», слухаеш моцныя галасы і верыцца: не так!

П. НАВОЙЧЫК.

СПАДЧЫНА





# ДЛЯ ЦЯБЕ

Пра вынаходлівасць савецкіх гаспадынь даўно ходзяць легенды. А мы не стамляемся іх падтрымліваць, працягваем здзіўляць сваякоў і знаёмых, часам нават саміх сябе, смачнай ежай, прыгатаванай з самых звычайных кампанентаў. Прапануем вам некалькі рэцэптаў, якія дапамогуць стаць ці застацца ўладальніцай ганаровага звання «сапраўдная савецкая гаспадыня».

ЭКАНОМНЫЯ РЭЦЭПТЫ

## Пальчыкі абліжаш!

### Таннае пячэнне

Яйкі для яго непатрэбны. Купіце толькі 200 г смятаны, столькі ж маргарыну, а муку вазьміце са сваіх старых, танных запасаў, калі яшчэ маецца такія. Маргарын трэба старанна здрабніць (можна выкарыстаць для гэтага буйную тарку), перамяшаць са смятанай і пачаць мясіць цеста, паступова дадаючы ў яго столькі мукі, колькі яно «возьме», пакуль не стане крутым (але не вельмі). Патрымайце яго каля гадзіны ў халадзільніку, а потым пачынайце вырабляць пячэнне.

У першым выпадку вам спатрэбіцца густое варэнне ці джэм. Раздзяліце цеста на чатыры часткі, танюсенька раскатайце кожны кавалак і памажце тонкім слоем варэння. Потым скруціце рулецікам і пакладзіце на патэльню (можна не мазаць яе тлушчам, пячэнне добра ўстае). У вас атрымалася чатыры рулецікі, якія хутка выпякаюцца. Яшчэ гарачымі парэжце іх на невялікія кавалкі і пасыпце цукровай пудрай. Пячэнне гатова.

Тое ж цеста можна выкарыстаць інакш. Раскатаўшы яго ў тонкі пласт, разрэжце ад цэнтра на трохвугольнікі. На шырокую крысу кожнага пакладзіце якую-небудзь салодкую начынку і, пачынаючы з яго, закруціце да вузкага канца. Рагалікі можна яшчэ абмакнуць у цукар перад тым, як класці на патэльню.

### Ікра з буракоў

Мясцовыя магазіны «Садавіна-гародніна» не балуюць нас наяўнасцю далікатэсаў, аднак звычайныя буракі, морква і цыбуля — пад рукой у кожнай руплівай гаспадыні. Дарэчы, страва настолькі ж карысная і лёгкая ў прыгатаванні, наколькі і танная.

Напалову звараныя буракі (3—4 шт.) і моркву (1—2 шт.) нацерці на крупнай тарцы. Перамяшаць з нарэзанай дробна цыбуляй (1—2 шт.) і тушыць з алеем (4—5 сталовых ложак) 20 хвілін. Калі вы аддаеце перавагу салёнаму, дадайце па густу соль, хоць можна абыходзіцца і без яе. Нават на святочным стале намазаная на тонкія лустачкі белага хлеба ікра з буракоў будзе дарэчы. Дзейнічайце!

ВЫРАТОЎВАЙЦЕСЯ САМІ

## НА СТРЭСЫ ЗАБЫВАЮЦЦА Ў ВАННЕ

Апошнія дні прыносяць нам больш нагод для страты нерваў, чым для іх супакаення. Разам з павышэннем цэн і веснавым авітамінозам да студэнтаў наблізіўся час здачы курсавых і дыпломных работ, крыху пазней — залікаў, выкладчыкам таксама дарэчы падрыхтавацца да стрэсавых атак. Наўрад ці хто абароніць нас, акрамя нас саміх. Нерваў ужо не хапае, каб самастойна спыніць сябе ў запале сваркі ці ў напружаным вячэрнім роздуме аб бясконцых праблемах...

Паспрабуйце залезці ў ванну! Спачатку прыміце гігіенічны душ, каб парадавацца чысціні свайго цела, а потым можна рыхтаваць адзін з простых і лячэбных адначасова раствораў, якія даюцца ніжэй.

ГЛІЦЭРЫНАВАЯ ВАННА. Прыблізна 200—250 мл гліцэрыны ўліць у ванну, добра перамяшаць. Пасля працэдуры скура становіцца гладкай, шаўкавістай, хоць тэмпература вады павінна быць даволі высокай — 38—40 градусаў.

САЛЯВАЯ ВАННА. Кілаграм марской ці кухоннай солі раствараюць у вадзе пры тэмпературы 37 градусаў. Соль не заўсёды добра ачышчана, таму лепш пашыць палатняны мяшочак, усыпаць у яго патрэбную колькасць солі і павесіць на кран, пакуль напаўняецца вана — усе непатрэбныя прымесі асядуць на тканіне.

Лічыцца, што салявыя ванны трэба праводзіць курсамі праз шэсць дзён адзін раз кожнае паўгоддзе. Але перад пачаткам працэдур парайцеся з урачом, бо яны не ўсім дазваляюцца.

ВАЛЕР'ЯНАВАЯ ВАННА. Для яе вам трэба купіць у аптэцы дзве бутэлькі стандартнага спіртавога настою валер'яны і ўліць у ванну з тэмпературай вады 37 градусаў. Працягласць — 15—20 мінут.

ВАННА З ТРАЎ. Для прыгатавання адвару неабходна 500—700 г высушаных і здробленых траў ці 1,5—3,0 кг сыравіны ў стане натуральнай вільготнасці на 8—10 літраў халоднай вады. Давесці да кіпення (карэнні і буйныя галінкі кіпяціць 10—15 мінут), настаяць 40—50 мінут (абавязкова ў эмаліраваным посудзе), працэдзіць і ўліць у ванну, затым давесці колькасць вады да патрэбнага аб'ёму. Для такой ванны падыходзяць ваўчкі, канюшына, лісце смароды, ігліца хвоі, хвошч, рамонак, мацярдушка, мята, чабор.

У састаў любой з выбраных вамі ваннаў павінны абавязкова ўваходзіць вашы светлыя думкі, добры настрой і найлепшыя надзеі!

Не выйшла пакуль з друку ніводнага вучэбнага дапаможніка, які б падказаў, як жыць ва ўмовах пераходу нашай краіны да рыначных адносін. Застаецца спадзявацца кожнаму на ўласны розум — вопыт, а таксама на чые-небудзь карысныя парады.

Прапануем вам заняткі ў рыначным лікбезе, якія праводзіць псіхолаг А. ТАЛМАСАВА.

## Плюсы беднасці

РЫНАЧНЫ ЛІКБЕЗ

*Зусім нядаўна мы лічылі сябе пастаяннымі даўжнікамі дзяржавы: нас бясплатна лячылі, давалі адукацыю, кватэру, забяспечвалі пенсіяй. А зараз высветлілася, што ўсё наадварот: дзяржава ў даўгу перад намі — за загубленую прыроду, нясцерпныя выдаткі на ўзбраенне, неразумна патрачаныя грошы на праекты стагоддзя, абясцэненую працу...*

*Добра, што мы даведаліся пра гэта. Але менавіта тут і падпільноўвае нас небяспека: заняць пазіцыю чакання таго моманту, калі дзяржава верне нам даўгі. Калі такую пазіцыю абяруць усе — мы прапалі. Даўгі — праблемы дзяржаўныя. А мы лепш пагаворым пра жыццё прыватнае. Калі мы хочам дасягнуць поспеху, галоўнае правіла — забыць пра тое, што нехта ў даўгу ў нас, і разлічваць толькі на свае сілы.*





*Гэта выгадна адразу ў некалькіх аспектах: невядома, ці вернуць доўг і калі гэта здарыцца; чаканне можа пагоршыць характар, бо чалавек пастаянна адчувае сябе пакрыўджаным; да таго ж, поспех, самастойнае выйсце са складанага становішча заўсёды павышае ўпэўненасць, пачуццё ўласнай годнасці, узбагачае новым веданнем сябе і навакольнага свету. Менавіта так — з разлікам на ўласныя сілы — трэба прыстасоўвацца да новых умоў жыцця.*

*Чакаць, што праблемы паляпшэння ўмоў працы, павышэння заработнай платы вырашацца самі сабой, сёння вельмі непрадбачліва. Лепш прыкласці намаганні і знайсці новае месца работы. Зараз назіраецца адток лепшых спецыялістаў з дзяржаўнага сектара ў альтэрнатыўную эканоміку. Многія ацэньваюць дзеянні гэтых людзей як здрадніцкія, эгаістычныя. Але што можа быць больш натуральным і лагічным, чым імкненне чалавека атрымліваць за адну і тую ж працу ў два разы больш? Фраза «гэта патрэбна для інтарэсаў вытворчасці» — з багажа маніпуляцый: вытворчасць — аб'ект неадушаўлёны, у яго не можа быць інтарэсаў. Расшыфраваць гэту фразу можна так: «гэта патрэбна для інтарэсаў кіраўніцтва (дырэктара — ведамства — ўрада), якое дрэнна працуе, але адказнасць за сваю работу стараецца перакласці на вас».*

*Яшчэ больш складанай, чым выбар месца работы, з'яўляецца зараз праблема скарачэння працоўных месц. Каб не стаць ахвярай беспрацоўя, варта звярнуць увагу на аб'явы, якія запрашаюць на работу. Часцей за ўсё патрабуюцца юрысты і бухгалтары, менеджэры і псіхолагі, а таксама спецыялісты сферы паслуг. Няхай гэта інфармацыя дапаможа ўсім, хто яшчэ не вырашыў для сябе праблему «куды пайсці вучыцца?» Навукова абгрунтаваны прагноз змяненняў у структуры занятасці па асобных рэгіёнах павінен стаць цяпер адной з галоўных задач прафесійных саюзаў.*

*Сацыяльныя ўмовы, у якіх пражылі мы многія гады, садзейнічалі росту нашай няўпэўненасці ў сабе, бездапаможнасці, а галоўным выхаваўцам была дзяржава, якая занадта часта паўтарала: «Нельга!» Але тыя мільёны людзей ва ўсім свеце, якія жывуць ва ўмовах рынку даўно, наўрад ці шмат у чым лепшыя за нас. У нашай беднасці і нявопытнасці ёсць нават свае плюсы. Нас цяжка напужаць чым-небудзь: мы можам абыходзіцца не толькі без кухоннага камбайна, але і без гарачай вады. Мы ўсё ўмеем: самі будуем дачы, рамантуем аўтамабілі, вырошчваем для сябе бульбу, шыем, варым варэнне. Мы ж тая галота, якая на выдумку здатная, толькі накіроўваць выдумку трэба не на набыццё, а на вытворчасць. І дадаць да яе пачуццё поўнай адказнасці за сваё жыццё.*




## Купілі?

Што такое роздум ля прылаўка, мы ўжо амаль што не помнім: купляем усё, што трапляецца. Магчыма, павышэнне цэн уняе карэктывы ў нашы звычкі, але не так проста змяніць за кароткі тэрмін тое, што фарміравалася гадамі. Таму калі вы працягваеце купляць кожную рэч, якую бачыце ў продажы, вучыцеся насіць нават гэта з густам і, калі ёсць патрэба, перашываць па сваёй фігуры. Тое-сёе раіць вам канструктар Н. МАЛЬКОВА.

Не засмучайцеся, калі бачыце, што набытая рэч крыху не падыходзіць вам, недзе шырокая, у другім месцы вузкая... Многія дэфекты лёгка ліквідаваць. Помніце, што не так мала фігур, якія наогул не адпавядаюць стандартам, прынятым нашай прамысловасцю. Дык не адмаўляцца ж кожны раз іх уладальнікам ад рэчаў, якія падабаюцца.

Спадніцу падбіраюць так, каб яна падыходзіла па аб'ёму бёдзер, а не таліі — талію можна прыгнаць па фігуры. Шырокую спадніцу заўсёды можна звузіць, убраўшы лішкі ў бакавыя швы (мал. 1). Толькі калі на спадніцы ёсць асіметрычна размешчаная група складак, трэба сачыць за тым, каб яны не занадта пайшлі ўбок. У спадніцы тыпу «партфель» проста перастаўляюць гузікі. Плісіраваную спадніцу ўкарочваюць зверху (мал. 2).

Калі пры прымерцы сукенкі вы бачыце, што талія вышэй, чым трэба, ад такой рэчы трэба адмовіцца. Калі ніжэй — паправіць проста (мал. 3), аднак на баваўнянай сукенцы рабіць гэта лепш пасля яе мыцця.

## Дык насіце!

Залішне шырокую ў грудзях сукенку можа звузіць, убраўшы лішкі ў бакавыя швы (мал. 4). Лішнія зморшчынкі лёгка ўбраць, паглыбіўшы вытачку (мал. 5).

Вузкае ў плячах і спінцы адзенне паправіць нельга. Але пры залішняй шырыні лішняе ўбіраецца ў швы.

Перарабіць няўдалыя рукавы рэглан і кімано цяжка. Пры ўшыўным рукаве папраўкі магчымы: паглыбіць пройму, лішкі ўбраць ў плечавое шво ці ў какетку. Рукавы звужаюцца па шву, у напрамку да проймы (мал. 6а).

Можна і ўкараціць рукаў (мал. 6б).




### СКАРБОНКА ПАРАД

Трэба быць уважлівай да каўняра: калі ён вялікі ля гарлавіны, папраўка немагчыма.

Засцёжка часцей за ўсё карэкціруецца простай перастаноўкай гузікаў. Пры двухбортнай засцёжцы зрушваюцца абодва рады. Пры аднабортнай можна і не перастаўляць гузікі, калі ўбраць залішнюю шырыню ў бакавыя швы.

Лёгка — у плечавыя швы і шво па гарлавіне — убіраюцца таксама зморшчынкі пад каўняром на спінцы (мал. 7).

У штанах залішняя шырыня ўбіраецца ў задняе шво, тут жа і выпускаецца тканіна (калі ёсць запас), калі штаны ў таліі трэба пашырыць (мал. 8). Звужаюць штаны за кошт вонкавых і ўнутраных швоў (мал. 9).

Вертыкальныя складкі на рукаве рэглан звычайна бываюць з-за празмернага пашырэння верхняй часткі рукава. Каб пазбавіцца дэфекту, папрыколвайце лішкі тканіны ў вертыкальную складку, вымерайце яе глыбіню і ўбярыце лішняе ў вонкавае шво рукава. (мал. 10).

Гарызантальныя складкі на скаце ўтачнога рукава бываюць з-за таго, што занадта высокая галоўка рукава ў яго верхняй частцы. Як пазбавіцца гэтага недахопу, паказана на мал. 11.

Нахіленыя складкі на крысе, каля проймы, бываюц у выпадку, калі бакавая частка крысы занадта доўгая. Падкройце дэталь, як паказана на мал. 12. Велічыню лішку вызначаюць пры прымерцы.

Калі на крысе ўтвараецца адна ці некалькі вертыкальных складак, значыць, па лініі грудзіны крыса і пройма залішне шырокія. Складачку закалоць, памерыць глыбіню і ўнесці карэктывы, як паказана на мал. 13.

Пры занадта шырокай гарлавіне ўтвараюцца касыя складкі па плечавым шве. Каб паправіць дэфект, пераносяць вяршыню гарлавіны ў бок сярэдзіны перада і дадаюць у гэтым пункце 1 см па вышыні. Пасля чаго ўдакладняецца даўжыня пляча і афрмляецца новая лінія проймы (мал. 14).

Ну што, ці атрымалася ваша рэч камфортнай пасля перарабак? Можа такія пакуты каштуюць больш, чым роздум ля прылаўка?

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

18 красавіка

Зак. 2061.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.